**Фотадакументальная выстава**

# “ПА МАТЭРЫЯЛАХ РАССЛЕДАВАННЯ ФАКТАЎ ГЕНАЦЫДУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА: ПРУЖАНСКІ РАЁН”

Шмат гора і пакутаў зведала беларуская зямля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Незлічоныя людскія страты, знішчаныя населеныя пункты, разбураная гаспадарка, разрабаваныя культурныя каштоўнасці – жудасны вынік ваеннага ліхалецця для нашай краіны.

У Рэспубліцы Беларусь заўсёды надавалася вялікая ўвага захаванню памяці аб вайне. Аднак, у апошнія гады, калі пачалося пераасэнсаванне многіх падзей мінулага, нельга дапусціць скажэння інфармацыі пра падзеі 1941 – 1945 гг. на Беларусі. Дзеля захавання памяці пра мільёны савецкіх грамадзян, якія сталі ахвярамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, заканадаўчага забеспячэння абароны фундаментальных каштоўнасцей беларускага народа, устанаўлення дзейсных бар’ераў на шляху спроб фальсіфікацыі падзей і вынікаў Другой сусветнай вайны, справядлівай ацэнкі злачынстваў нацыстаў і іх памагатых, нацыяналістычных фарміраванняў у гады вайны і пасляваенны перыяд 5 студзеня 2022 года быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа».

З 2021 года, калі Генеральная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факце генацыду насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны час, былі ўстаноўлены новыя звесткі пра злачынства фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі. Такое расследаванне праводзіцца і на тэрыторыі нашага раёна. У выніку сумеснай работы пракуратуры Пружанскага раёна, Пружанскага міжраённага аддзела Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, аддзела культуры райвыканкама прыйшлі да высновы, што страты на нашай зямлі былі значна большымі, чым лічылася раней.

Паводле ўстаноўленых звестак ў гады Вялікай Айчыннай вайны на Пружаншчыне загінула каля 20 тысяч жыхароў. Больш за тысячу ваеннапалонных былі закатаваны ў 5 месцах прымусовага ўтрымання. Амаль поўнасцю загінула яўрэйскае насельніцтва, якое ўтрымлівалася ў пружанскім і ружанскім гета. Вечным напамінам аб злачынствах фашыстаў з’яўляюцца 57 пахаванняў Другой сусветнай вайны. Каля 5 тысяч чалавек былі адпраўлены на прымусовыя работы ў Германію і іншыя еўрапейскія краіны, многія з якіх не вярнуліся. На франтах ваявалі больш за 8 тысяч пружанцаў, каля 2,5 тысяч загінулі ці прапалі без вестак. Больш чым за тры гады акупацыі нямецка-фашысцкія карнікі і іх памагатыя на тэрыторыі нашага раёна спалілі 134 населеныя пункты, 43 з якіх не аднавіліся. Яны знішчылі і разбурылі больш за 7 тысяч жылых дамоў, звыш 10 тысяч гаспадарчых будынкаў (у тым ліку электрастанцыю, хлабазавод, маслазавод, 17 школ, 2 бальніцы, 6 клубаў) і інш.

Нельга забываць пра падзеі мінулага, неабходна захоўваць памяць маладога пакалення пра гераічныя і трагічныя старонкі нашай гісторыі, прыкладаць намаганні для захавання міру.

## Страты Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Перамога над ворагам была дасягнута цаной вялікіх ахвяр і страт беларускага народа. Нямецкія захопнікі пакінулі пасля сябе жудасны крывавы след, трагедыю і разбурэнне. Гэта быў загадзя распрацаваны і мэтанакіраваны план генацыду, знішчэння людзей, разрабавання нацыянальных каштоўнасцяў краіны, ліквідацыі дзяржаўнага ладу. На захопленай тэрыторыі нацысты парушылі ўсе міжнародныя прававыя нормы. Злачынствы акупантаў па сваёй масавасці і жорсткасці не ведалі сабе роўных ў навейшай гісторыі Беларусі. Па ацэнках спецыялістаў, Беларусь пацярпела ад гэтай вайны больш, чым якая-небудзь іншая краіна Еўропы.

Расследаваннем злачынстваў акупантаў і вызначэннем памераў страт ў вайне, займалася спецыяльна створаная Надзвычайная дзяржаўная камісія, якая абапіралася на дакументальныя сведчанні. На тэрыторыі Беларусі гэта работа вялася з пачатку 1944 г.

**Матэрыяльныя страты, якія панесла Беларусь у перыяд акупацыі, складаюць 75 млрд. руб. (у цэнах 1941 г.), што ў 35 разоў перавышала бюджэт рэспублікі 1940 г.**

На беларускай зямлі **нямецкія захопнікі спалілі, разбурылі і разрабавалі 209** з 270 **гарадоў і раённых цэнтраў** (на 80-90% былі разбураны Мінск, Гомель, Віцебск), **9200 вёсак**.

**Агульныя статы прамысловасці** склалі 6225 млн. руб. (у цэнах 1941 г.). Эканоміка рэспублікі па прамысловых і энергетычных магутнасцях была адкінута на ўзровень 1913 г. Акупанты спалілі і разбурылі 100465 прамысловых вытворчых будынкаў. Было знішчана ці вывезена ў Германію 10338 прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку ўсе буйныя электрастанцыі (85% іх даваеннай колькасці).

Надзвычайная дзяржаўная камісія па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў выявіла, што **маёмасныя страты сельскай гаспадаркі** склалі 22471,9 млн. руб. Было знішчана 10 тыс. калгасаў, 92 саўгасы, 316 машынна-трактарных станцый, 1200 тыс. сельскіх будынкаў, у тым ліку 421 тыс. жылых дамоў калгаснікаў.

Варварскімі метадамі планава **знішчаліся і рабаваліся ўстановы культуры і навукі, адукацыі.**

Згодна дадзеных Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, з 1941 г. па 1944 г. было знішчана 10 музеяў, страты склалі 163,4 млн. руб. 8 музеяў былі поўнасцю разрабаваны. У краіны Цэнтральнай і Заходняй Еўропы былі вывезены многія творы беларускага, рускага і заходнееўрапейскага мастацтва, у тым ліку каля 1700 твораў жывапісу і ікон, больш за 50 скульптур, шматлікія малюнкі, гравюры, музычныя інструменты, мэбля, якія захоўваліся ў Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР. Толькі невялікая частка выкрадзенага была вернута Беларусі.

У гады вайны Беларусь пазбавілася свайго нацыянальнага сімвалу — Крыжа Ефрасінні Полацкай, унікальнай каштоўнасці, створанай у 1161 г. Была страчана і знакамітая калекцыя слуцкіх паясоў, у якіх ярка адлюстравана высокае мастацкае майстэрства і самабытнасць беларускага народа.

Амаль поўносцю была знішчана рэспубліканская сістэма бібліятэк, разрабаваны яе кніжны фонд, які складаў 10 млн. экзэмпляраў. Толькі з фондаў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І.Леніна (у 1941 г. налічвалася 2 млн. тамоў) было страчана больш за 1,5 мільёна тамоў, сярод якіх рэдкія і старадрукаваныя выданні, рукапісы. Сёння каля 1 млн. тамоў застаецца нязнойдзенымі.

Былі разбураны 5 тыс. тэатраў і клубаў.

Акупантамі былі знішчаны Беларуская акадэмія навук і 24 навуковыя ўстановы.

За гады вайны былі спалены і разбураны 8825 з 12294 школ. Матэрыяльныя страты, нанесеныя ўстановам адукацыі рэспублікі, склалі 4,6 млрд. руб.

Але самай балючай і цяжкай стратай стала **гібель людзей**.

За гады акупацыі гітлераўцы правялі звыш 140 карных аперацый, падчас якіх поўнасцю ці часткова былі знішчаны 5454 вёскі. Жудасным сімвалам злачынстваў гітлераўцаў на беларускай зямлі стала вёска Хатынь, спаленая разам з жыхарамі. Яе лёс падзялілі яшчэ 618 сельскіх населеных пунктаў, 188 з якіх не адноўлены (дадзеныя ўдакладняюцца).

На тэрыторыі Беларусі існавала каля 250 лагераў савецкіх ваеннапалонных і 350 месцаў прымусовага ўтрымання насельніцтва. Толькі ў вёсцы Трасцянец, дзе знаходзіўся адзін з самых буйных па колькасці знішчаных людзей нацысцкіх лагераў смерці, загінула 206500 чалавек. У адрозненні ад Асвенцыма, Майданэка і Трэблінкі ў ім знаходзілася галоўным чынам мясцовае насельніцтва. У 186 населеных пунктах былі створаны яўрэйскія гета. У мінскім гета ўтрымлівалася каля 100 тыс. чалавек, з якіх выжылі адзінкі. Беларускія вучоныя сцвярджаюць, што ў Беларусі за гады вайны было знішчана 715 тыс. яўрэяў.

Лічыцца, што ў перыяд акупацыі ў Германію на прымусовыя работы было вывезена каля 400 тыс. чалавек, у тым ліку 24 тыс. дзяцей.

Статыстыка сведчыць: калі да вайны на тэрыторыі Беларусі пражывала 9,2 млн. чалавек, то ў канцы 1944 г. — 6,3 млн. чалавек.

Па дадзеных Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, усяго на тэрыторыі БССР было забіта 2219316 чалавек грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных. Пазней высветлілася, што гэтыя звесткі былі паменшаны, а дадезеныя па некаторых лагерах – недакладныя. У гэтыя лічбы таксама не былі ўключаны байцы Чырвонай Арміі з ліку беларускіх жыхароў, якія прапалі без вестак ці трапілі ў палон і загінулі там. Не былі ўлічаны і мірныя жыхары, вывезеныя ў Германію і загінуўшыя там. Сёння некаторыя даследчыкі лічаць, што за гады Вялікай Айчыннай вайны **загінула ад 2,5 да 3 і больш млн. жыхароў Беларусі, гэта значыць не менш, чым кожны трэці.**

# Закон “Аб генацыдзе беларускага народа”

ЗАКОН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
от 5 января 2022 года №146-З

О геноциде белорусского народа
Принят Палатой представителей 14 декабря 2021 г.
Одобрен Советом Республики 22 декабря 2021 г.

Настоящий Закон принят в целях сохранения памяти о миллионах советских граждан, которые стали жертвами в годы Великой Отечественной войны и послевоенный период*, в соответствии с Конституцией Республики Беларусь, а также на основе Конвенции о предупреждении преступления геноцида и наказании за него от 9 декабря 1948 года, Конвенции о неприменимости срока давности к военным преступлениям и преступлениям против человечества от 26 ноября 1968 года и направлен на законодательное обеспечение защиты фундаментальных ценностей белорусского народа, установления действенных барьеров на пути попыток фальсификации событий и итогов Второй мировой войны, дачи справедливой оценки злодеяниям нацистских преступников и их пособников, националистических формирований в годы Великой Отечественной войны и послевоенный период.

**Статья 1.** Совершенные нацистскими преступниками и их пособниками, националистическими формированиями в годы Великой Отечественной войны и послевоенный период злодеяния, направленные на планомерное физическое уничтожение белорусского народа** путем убийства и иных действий, признаваемых геноцидом в соответствии с законодательными актами и нормами международного права, являются геноцидом белорусского народа.

---

* Под послевоенным периодом для целей настоящего Закона понимается период по 31 декабря 1951 г.

** Под белорусским народом для целей настоящей статьи понимаются советские граждане, проживавшие на территории Белорусской Советской Социалистической Республики в годы Великой Отечественной войны и (или) послевоенный период.

**Статья 2.** Дополнить Уголовный кодекс Республики Беларусь от 9 июля 1999 г. статьей $130^2$ следующего содержания:

**«Статья $130^2$. Отрицание геноцида белорусского народа**

1. Отрицание геноцида белорусского народа, содержащееся в публичном выступлении, либо в печатном или публично демонстрирующемся произведении, либо в средствах массовой информации, либо в информации, размещенной в глобальной компьютерной сети Интернет, иной сети электросвязи общего пользования или выделенной сети электросвязи, – наказывается арестом, или ограничением свободы на срок до пяти лет, или лишением свободы на тот же срок.

2. Действие, предусмотренное частью 1 настоящей статьи, совершенное лицом, ранее судимым за отрицание геноцида белорусского народа, либо должностным лицом с использованием своих служебных полномочий, – наказывается лишением свободы на срок от трех до десяти лет.».

**Статья 3.** Генеральной прокуратуре принять дополнительные меры по всестороннему, полному и объективному исследованию обстоятельств геноцида белорусского народа, установлению лиц, причастных к его совершению, и их уголовному преследованию.

**Статья 4.** Совету Министров Республики Беларусь: на постоянной основе принимать меры по: увековечению памяти жертв геноцида белорусского народа, а также по признанию и осуждению геноцида белорусского народа на международном уровне; Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 11.01.2022, 2/2866 2 распространению достоверной информации о геноциде белорусского народа, а также по просвещению граждан по вопросам геноцида белорусского народа; в шестимесячный срок принять иные меры, направленные на реализацию настоящего Закона.

**Статья 5.** Настоящий Закон вступает в силу через десять дней после его официального опубликования.

**Президент Республики Беларусь** **А.Лукашенко**